Намі разгледжаны далёка не ўсе, а толькі найбольш адметныя аспекты тэмы працы ў беларускай парэміялогіі. І тым не менш можна сцвярджаць, што каштоўнасць гэтых прыказак заключаецца ў іх вялікай мудрасці і надзённасці незалежна ад часу стварэння.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Прыказкі і прымаўкі: у дзвюх кнігах / АН БССР, Ін –т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 1. – 560 с.; кн. 2. – 616 с.

УДК 316.7 161.3(438) (476)

## БЕЛАСТОК І БЕЛАРУСКАЯ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА

**Банцэвіч П. К.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

У апошнія дзесяцігоддзі Беларусь сутыкнулася з праблемай захавання сваіх культурных межаў ва ўмовах выклікаў трэцяга тысячагоддзя, такіх як глабалізацыя сусветнай культурнай прасторы, медыялізацыя культуры, масавая міграцыя, узмацненне тэндэнцый крызісу ідэнтычнасці і сацыякультурнай маргіналізацыі грамадства. У сферы духоўнай культуры набралі моц працэсы, якія патрабуюць распрацоўкі адэкватных стратэгій сацыякультурнага развіцця на аснове паглыбленага навуковага аналізу культурнага вопыту.

Уваходжанне Беларусі ў сусветны гісторыка-культурны працэс прадугледжвае глыбокае асэнсаванне перспектыў развіцця дзяржавы на аснове нацыянальных прыярытэтаў і базавых каштоўнасцей культуры. Неабходнасць на сучасным этапе прааналізаваць свой гістарычны шлях, здабыткі і страты ўласнай культуры, вызначыць найбольш прыдатныя метады і сродкі, якімі можна ўзняць нацыянальную годнасць, патрабуе больш дасканалага вывучэння генезісу, сутнасці і парадыгмаў беларускай культуры, яе развіцця ў сучаснай цывілізацыйнай прасторы. Паўстае праблема высокапрафесійнай інтэрпрэтацыі нацыянальнай культурнай спадчыны на філасофскім, культуралагічным, гістарычным узроўнях і канструявання мадэлі беларускай культуры.

Беласток і Беласточчына цесна звязаныя з беларускім грамадска-палітычным і культурным жыццём. 20 верасня 1944 года паводле пагаднення паміж савецкім і польскім урадамі Беласток з навакольнымі раёнамі быў перададзены Польшчы, у складзе якой было



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

адноўлена Беластоцкае ваяводства. Частка абазнаных у гісторыі беларусаў і да гэтага часу кажуць пра «наш Беласток». Аднак сярэднестатыстычны беларус найперш скіроўваецца да распродажаў у «Галерэю Бялу» і «Ашан». Беларускі Беласток яго не цікавіць. Можна сцвярджаць, што беларуская гісторыка-культурная спадчына Беласточчыны вельмі аддалена ад сучасных беларусаў.

Беласточчына адыграла вялікую ролю ў беларускім этнакультурным працэсе яшчэ ў познім сярэднявеччы. Супрасльскі манастыр, заснаваны ў XV ст., стаў духоўным цэнтрам беларускага праваслаўя, меў друкарню і бібліятэку. У Заблудаве ў 1567 г. была заснавана друкарня, дзе працавалі І. Фёдараў і П. Мсціславец. Ім належыць гонар выдання «Заблудаўскага евангелля» – помніка старажытнабеларускага пісьменства і друку. У 1573 г. друкарня перанесена ў Супрасль, а затым у Беласток.

У 1807 г. Беласточчына ўвайшла ў склад Расійскай імперыі. Тут была створана Беластоцкая вобласць, неўзабаве скасаваная і далучаная да Гродзенскай губерні (1842). На пачатку XX ст. колькасць насельніцтва горада наблізілася да 100 тыс. чалавек. Паводле заселенасці тэрыторыі і шчыльнасці насельніцтва, па развіццю прамысловасці і сельскай гаспадаркі Беласточчына пераўзыходзіла іншыя рэгіёны Беларусі. Развіваецца таксама адукацыя (Беластоцкая гімназія з 1873 г. рэальнае сярэдняе вучылішча).

З Беластокам звязаны такія значныя падзеі беларускай гісторыі і культуры, як Слуцкае паўстанне, сход ТБШ, стварэнне выдавецка-асветніцкага таварыства «Сяўба», тэатральнага кааператыва «Полымя», выдавецтва тыднёвіка «Ніва». У Беластоку праходзілі Павятовы з’езд Беларускай сялянска-работніцкай грамады, Народны сход Заходняй Беларусі. У беларускім сацыяльна-палітычным і культурным жыцці Беластока прымалі удзел І. Дварчанін, К. Чаховіч, Я. Драздовіч, М. Забэйда-Суміцкі, Р. Шырма, Я. Купала, А. Карпюк.

У 1999 г. Беластоцкае ваяводства было скасавана і ўвайшло ў Падляшскае ваяводства з цэнтрам у Беластоку.

У горадзе створаны і дзейнічаюць нацыянальныя беларускія арганізацыі (Беларускае грамадска-культурнае таварыства, Беларускі саюз у Польшчы, Беларускае аб'яднанне студэнтаў). На беларускай мове выдаецца тыднёвік «Ніва», друкуюцца матэрыялы ў іншых перыядычных выданнях («Czasopis», «Białoruskie Zeszyty Historyczne»). Літаратурна-мастацкае аб'яднанне «Белавежа» спрыяе развіццю беларускай літаратуры ў Польшчы, выдала больш за 100 кніг. Беларускія пісьменнікі Беласточчыны (С. Яновіч, В. Швед, М. Гайдук, М. Лукша) праявілі сябе ў самых розных літаратурных жанрах.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Даследаваннем гісторыі і культуры беларусаў займаюцца мясцовыя навукоўцы Я. Мірановіч, А. Латышонак, В. Харужы і інш. На Беласточчыне існуюць шматлікія беларускія мастацкія калектывы, арганізуюцца культурна-мастацкія фестывалі, святы (фестываль «Беларуская песня», «Басовішча», «Бардаўская восень», свята «Купалле»). Есць у горадзе пачатковая школа і гімназія, дзе вывучаецца беларуская мова, а ў Беластоцкім універсітэце працуе кафедра беларускай культуры. У Беластоку знаходзіцца Генеральнае Консульства Рэспублікі Беларусь, якое спрыяе пашырэнню кантактаў Беласточчыны і Беларусі.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Найдзюк, Я. Беларусь учора і сёння: папулярны нарыс з гісторыі Беларусі / Я. Найдзюк, І. Касяк. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 413 с.
2. Пракопчык, Б. Невядомы Беласток / Б. Пракопчык // Звязда: газета. – 17 лістапада 2010. – № 225 (26833). – С. 2.
3. Скалабан, В. В. Укрупнение БССР: попытка 1928 года / В. В. Скалабан // 22. Беларусь і суседзі: Гістарычныя шляхі, узаемадзеянне і ўзаемаўплывы: Міжнародная навуковая канферэнцыя / пад рэд В. В. Скалабана, М. І. Старавойтава. – Гомель, 2006. – С. 184-187.
4. Трусаў, А. Невядомая нам краіна: Беларусь у яе этнаграфічных межах / А. Трусаў. – Мінск: Кнігазбор, 2009. – 152 с.


УДК 378.147

## ОБРАТНАЯ СВЯЗЬ В ПРОЦЕССЕ ПРЕПОДАВАНИЯ ИНОСТРАННОГО ЯЗЫКА


**Белова О. И., Лещук А. И.**

УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь


На современном этапе развития общества преподаванию иностранных языков уделяется особое внимание. Процесс обучения не даст результатов, если не будут соблюдаться два важнейших условия: для студента – возможность задать вопросы, для преподавателя – возможность узнать, насколько полно и качественно студент усвоил материал.

Студенты играют важную роль в оценке, развитии и повышении качества преподавания. Невозможно качественно выполнить работу без понимания того, насколько эффективно достигается ее результат. Такое понимание возможно только при появлении информации, позволяющей оценить, что было сделано. Сбор, интерпретация, анализ и реагирование на такого рода информацию называется обратной связью, получение которой способствует пониманию того, как преподава-



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ